Еўрапейскі выбар

**Вясна 2026**

# Праграма выбарчага спісу "Еўрапейскі выбар"

**Еўрапейскі выбар** — гэта пра ўсіх нас. Гэта пра годныя заробкі і сацыяльную абарону, пра магчымасці развіцця і адукацыі. Гэта пра дзяржаву для чалавека, дзе паважаюцца правы, дзейнічае закон і ствараюцца роўныя магчымасці.
Беларусь павінна стаць краінай, у якой годнае жыццё з'яўляецца нормай, а не прывілеем.

**Чалавек — галоўная каштоўнасць Беларусі**
Мы адстойваем мадэль дзяржавы для чалавека, дзе эканоміка, адукацыя і сацыяльная палітыка адданыя развіццю чалавечага капіталу. Еўрапейскі выбар — гэта выбар роўнасці, салідарнасці і адказнай дзяржавы, якая стварае ўмовы для самарэалізацыі кожнага.

**Мы — каманда прафесіяналаў, якая не баіцца адказнасці**
У нас няма выпадковых людзей, мы аб'ядноўваем экспертаў, аналітыкаў, эканамістаў і менеджараў з рэальным досведам працы ў Беларусі і еўрапейскіх краінах. Нам ёсць што прапанаваць Беларусі ўжо сёння: канкрэтныя сэрвісы, прадукты, інструманты, прафесійны падыход і кампетэнцыі. Мы ўмеем працаваць і ведаем, як укараніць лепшае з еўрапейскага досведу ў беларускія рэаліі. У нас ёсць выразнае бачанне будучыні Беларусі і разуменне, як яго рэалізаваць. Мы не чакаем зменаў, а працуем над імі ўжо сёння, ствараючы інструменты і рашэнні для будучай дэмакратычнай Беларусі.

Праграма дзеянняў выбарчага спісу "Еўрапейскі выбар" у Каардынацыйнай радзе:

**міжнародная супраца і прасоўванне Еўрапейскага выбару** Беларусі праз умацаванне палітычнага і інстытуцыйнага дыялогу з Еўрапейскім Саюзам, парламентамі і міжнароднымі партнёрамі, замацаванне еўрапейскай перспектывы Беларусі ў палітыка-прававых дакументах ЕС і прыцягненне праграм падтрымкі, неабходных для рэформаў і аднаўлення краіны, распрацоўка стратэгіі супрацоўніцтва з Украінай

**падтрымка палітвязняў і пацярпелых ад рэпрэсій, людзей з інваліднасцю, жанчын, якія пацярпелі ад хатняга гвалту, ветэранаў і іншых уразлівых груп.** Адвакаванне іх правоў і інтэрэсаў, садзейнічанне іх легалізацыі, рэабілітацыі, рэсацыялізацыі і доступу да адукацыі, працы і сацыяльных паслуг.

**распрацоўка рэформ,** накіраваных на пабудову ў Беларусі прававой дзяржавы, эфектыўнай эканомікі і сацыяльнай бяспекі, якія адпавядаюць еўрапейскім стандартам і паляпшаюць дабрабыт насельніцтва, укараняюць прынцыпы вяршэнства права, гендарнай роўнасці, недыскрымінацыі і адмены смяротнага пакарання;

**стварэнне адукацыйных магчымасцяў** і сучасных праграм перакваліфікацыі для беларусаў як унутры краіны, так і за яе межамі. Садзеянне інтэграцыі беларусаў у еўрапейскую эканамічную прастору

**павышэнне мабільнасці і абароны правоў беларусаў за мяжой** праз адстойванне правоў на атрыманне віз і свабоду перамяшчэння, спрыянне легалізацыі і дакументаванню, доступа да банкаўскіх, адукацыйных, медыцынскіх паслуг і працоўных магчымасцяў, умацоўваючы міжнародную каардынацыю для сістэмнай і эфектыўнай абароны правоў кожнага беларуса.

**развіццё практычнага супрацоўніцтва з Украінай**, якое ўключае палітычную і міжнародную адвакацыю, гуманітарную падтрымку, экспертнае ўзаемадзеянне ў сферы бяспекі і рэформаў, удзел у распрацоўкі праграм пасляваеннага аднаўлення.

Зрабі свой Еўрапейскі выбар!